Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 21:19:44

DOI:10.17951/sb.2021.15.383-391
Studia Białorutenistyczne 15/2021 REVIEWS
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Zhanna Nekrashevich-Karotkaja / Жанна Некрашэвіч-Кароткая

Adam Mickiewicz University, Poznań (Poland)
e-mail: zhanek@amu.edu.pl
https://orcid.org/0000-0001-9544-2159

„Мая Беларусь" нямецкіх гуманітарыяў

Belarus-Reisen. Empfehlungen aus der deutschen Wissenschaft, hrsg. von Thomas M. Bohn und Marion Rutz. Wiesbaden: Harrassowitz Verlag, 2020, 270 s.

Ідэя „напісання кнігі пра Беларусь" лунала ў паветры Германіі практычна з пачатку XXI стагоддзя, але найбольшую актыўнасць адпаведныя інтэнцыі набылі ў апошнія гады. Вытлумачэнне гэтай акалічнасці знайсці няцяжка ў выпадку краіны, якая знаходзіцца „ў цэнтры або заходніх, або ўсходніх мандыялісцкіх летуценняў" (Martysûk, 2017, s. 207). Менавіта ідэя летуцення, мары, успаміну пра Беларусь легла ў аснову канцэпцыі кнігі *Belarus-Reisen. Empfehlungen aus der deutschen Wissenschaft (*Падарожжы ў Беларусь*:* парады ад нямецкіх навукоўцаў*)*, якая стала сумесным выдавецкім праектам вучоных з універсітэта горада Гісэн у Германіі: гісторыка Томаса Бона і літаратуразнаўцы Марыён Рутц, якія, у сваю чаргу, прапанавалі ўдзел у праекце сваім калегам. Праўда, мары і летуценні аўтараў гэтай кнігі маюць зусім рэальную аснову: яны грунтуюцца на іх асабістых перажываннях і ўражаннях ад сустрэч з Беларуссю – у геаграфічным (ландшафтным), культурным, даследчыцкім і перадусім „чалавечым" вымярэнні. Зборнік складаецца з шаснаццаці эсэ: два з іх напісалі самі выдаўцы-навукоўцы; яшчэ чатырнаццаць – іх калегі ды вучні, якія мелі ў жыцці досвед спазнання Беларусі, беларусаў і беларушчыны. Галоўнай устаноўкай была арыентацыя на шырокага нямецкага чытача.

Ва ўступе з „летуценнай" назвай (*A Belarusian Dream*) праблематызуецца моўна-намінатыўны аспект: сучасная нямецкая гуманістыка бачыць неабходнасць развітацца з пашыранай у Германіі назвай краіны *Weißrussland*, якая ў марфалагічных адносінах прыналежная да ніякага роду. „У выпадку Беларусі, – даводзяць выдаўцы, – якая так упэўнена праяўляе сябе ў сваёй рэвалюцыі, мы маем

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 21:19:44

справу з жаночым родам, з жанчынай" (с. VII–VIII). Аўтары зборніка ў большасці сваёй не толькі карыстаюцца назвай дзяржавы з артыклем жаночага роду (*die Belarus*), але таксама ўжываюць форму прыметніка *Belarusisch* з адной літарай „s" (472 выпадкі на 61 выпадак ужывання формы *Belarussisch*). Гэтыя інавацыйныя высілкі ў марфалагічна-граматычнай сістэме нямецкай мовы прадпрымаюцца з адзінай матывацыяй: сфарміраваць у чытача з нямецкай культурнай прасторы ўсведамленне пра „сімвалічную дыстанцыю", якая аддзяляе Беларусь ад Расіі. Арфаграфічныя інавацыі падлягаюць і філасофскаму асэнсаванню (не былі б то немцы!): у форме *B/belarusisch*, на думку ўкладальнікаў кнігі, утрымліваецца слушны момант адчужэння, які выдатна стасуецца з вобразам краіны як „белай плямы" ў Еўропе.

Агульную канцэпцыю кнігі найлепшымі чынам ілюструе артыкул лінгвіста Марка Бругемана: ён прэзентуе моманты адмысловага моўна-палітычнага душэўнага стану, які вызначае сённяшнюю Беларусь. Дэмакратычны дыскурс пасля падзей жніўня 2020 года вызначаюць, на думку аўтара, жанчыны – мірныя пратэстоўцы, а таксама беларуская мова. Слова „сцяг" без далейшых удакладненняў ясна маркіруе нацыянальны сімвал. Жанчына і сцяг утвараюць адмысловую пару[1]. Апроч таго, слова „сцяг/сьцяг" разглядаецца аўтарам у кантэксце існуючага арфаграфічнага расколу паміж „клясычным" правапісам і акадэмічнай нормай беларускай мовы, у сувязі з чым нават у Вікіпедыі існуюць два варыянты беларускай мовы з дзвюма канкурыруючымі арфаграфіямі.

Прыгадаю тут літаратуразнаўца Саймана Льюіса, аўтара яшчэ адной выдатнай кнігі пра Беларусь, якая выйшла ў 2019 годзе. Заяўляючы ў загалоўку сваёй кнігі пра ўласную альтэрнатыўную прэзентацыю Беларусі, ён адштурхоўваецца ад заштампаванага ўяўлення пра краіну як „постсавецкі парк Юрскага перыяду" (Lewis, 2019, s. 1). Падобным чынам, перад аўтарамі *Падарожжаў у Беларусь…* стаяла няпростая задача: у сітуацыі небывалага да жніўня 2020 года ўсплёску цікавасці да Беларусі зрабіць свой унёсак у адэкватнае інфармаванне нямецкамоўнай грамадскасці пра гэту краіну, якая не павінна больш заставацца пустым месцам і ствараць нагоды для бязглуздых пытанняў, кшталту: ці ёсць наогул розніца паміж Беларуссю і Расіяй; ці Беларусь – гэта не частка Расіі? Пры гэтым ледзь не кожны аўтар даводзіць, як мала ведалі яны (а значыць, ведаюць іх суайчыннікі) пра нашу краіну. З досведу маіх падарожжаў у Германію магу толькі пацвердзіць, што – на жаль – гэта сапраўды так.

Кніга прызначана для перыяду *Home Office* у сувязі з эпідэміяй каронавіруса – маўляў, седзячы на ізаляцыі, пачытайце і вызначце сабе маршруты будучых вандровак. Што да аўтараў, то імі аказаліся тыя навукоўцы, якія, з аднаго боку, захапляюцца беларускай музыкай, літаратурай, архітэктурай, наведваюць кнігарню „Логвінаў", але, з іншага боку, вандруюць па брукаванках і гравейках

[1] Гэтая ідэя візуальна ўвасоблена на вокладцы кнігі: фотаздымак жаночага сілуэта на фоне бела-чырвона-белага сцяга.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 21:19:44

Беларусі, блукаюць па лабірынтах Нацыянальнай Бібліятэкі ў Мінску і спазнаюць „соннае мястэчка Івянец" (Гун-Брыт Колер); захапляюцца Горадам Сонца Артура Клінава ды ацэньваюць „сацыялістычны шарм Брэста і еўрапейскае аблічча Гродна" (Аліса Мюлер), прыглядаюцца да Глыбокага з Касцёлам насупраць Царквы і месцам, на якім спалілі Сінагогу (Магдалена Валігурска). Яны кантактуюць з самымі рознымі людзьмі – навукоўцамі, міліцыянерамі, прадпрымальнікамі, хатнімі гаспадынямі, у тым ліку з 90-гадовай бабай Варай; прымаюць удзел у парадзе Перамогі 9 мая, дзівяцца на манументальны знак горада на ўездзе ў Салігорск – вышынёй у некалькі метраў, па-дзіцячаму шчыра захапляюцца жывымі парсючкамі на рынку ў Ракаве. Генрых Кіршбаўм і Яраслава Ананька склалі верш пра Навагрудак „на дваіх" – на беларускай і на нямецкай мовах, – бо ім не хапіла аднаго дня на „фізічнае" (вандроўнае і духоўнае) спазнанне старажытнага горада. Усе гэтыя прызнанні – найлепшае сведчанне таго, што аўтары насамрэч «у тэме».

Падсумаваць плён іх аналітычнай творчасці, часам аздобленай лёгкай (сама)іроніяй або рамантычнай настальгіяй, аказалася зусім не простай задачай. Аксана Бязлепкіна, гаворачы пра адносіны да літаратурнай класікі, слушна сцвярджала: каб яе зразумець, трэба быць падрыхтаваным чытачом; „а «перабраць» класіку, жартоўна пераасэнсаваць яе – прасцей" (Bâzlepkìna, 2014, s. 516). Падобным чынам, узровень падрыхтаванасці аўтараў эсэ розны: хтосьці больш фармальна і механічна „перабраў" свае ўспаміны пра Беларусь у адпаведнасці з добра зразумелымі нямецкаму чытачу прапагандысцкімі клішэ, хтосьці стварыў на іх аснове насамрэч прафесійны, вельмі кваліфікаваны аналітычны дыскурс. Было адразу заўважна, калі ў сваёй візіі Беларусі аўтар збіваў(/ла)ся на той прасцейшы шлях „перабірачкі": аповед адразу набываў стылістыку „страшылак" перыяду халоднай вайны пра пажарную трывогу ўначы і пра тараканаў у студэнцкім інтэрнаце, якія з парога кідаюцца вам пад ногі; пра монстрападобную дзяжурную ў тым жа інтэрнаце; пра бязглуздую бюракратыю, некампетэнтнасць і страшэнную блытаніну (г. зн. адсутнасць „орднунга"), бязлікую камерцыйную рэкламу на вуліцах Мінска, пра выпадкі карупцыі пры перасячэнні мяжы... Што праўда, гэтыя анекдоты з серыі „забаваў для піпла" ніяк не выпукліваюць вобраз Беларусі: мільгаценне твараў палітыкаў на плакатах паабапал аўтатрасаў у Германіі ў перыяд выбарчай кампаніі – такая ж „прамыўка мазгоў", як рэкламныя шчыты „Я люблю Беларусь" паабапал дарог у Беларусі; пажарную трывогу ўначы мне даводзілася рэгулярна перажываць у студэнцкім інтэрнаце ў Польшчы, а нямецкі Хаўсмайстар у студэнцкім гатэлі Дрэздэна выпраменьваў не больш пазітыву, чым размаляваная яркай памадай дзяжурная-зомбі ў мінскім інтэрнаце Сямёрка.

Падобныя „жахі-прыбабахі", разлічаныя на хатніх гаспадынь і пенсіянераў, у кнізе ёсць, але іх колькасць не „зашкальвае", яны не дамінуюць, няхай сабе часам суправаджаюцца рафінавана іранічным *Honni soit, qui mal y pense* – „ганьба таму, хто падумае благое", што быццам бы сказаў па-французску англійскі

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 21:19:44

кароль Эдуард III, – канешне, зусім не ў сувязі з Беларуссю. Разам з тым, усе аўтары (нават аматар (пост)савецкіх анекдотаў, якім праявіў сябе Рубэн Бівальд) дружна пацвердзілі слушнасць вылучаных С. Льюісам дзвюх дамінантных характарыстык сучаснай культурнай выявы краіны: першая – поліфанічнасць, другая – разрыў паміж гісторыяй і памяццю (Lewis, 2019, s. 1–2). Пры гэтым з эсэ больш старанных аўтараў вымалёўваліся вельмі істотныя, часам нечаканыя нават для вопытных даследчыкаў, адметнасці сённяшняй – і былой – беларускай ідэнтычнасці.

Па прачытанні *Падарожжаў у Беларусь…* я склала рэестр (можа, пад уздзеяннем нямецкага духу з яго „орднунгам”?) такіх „месцаў памяці”, рэлевантных для беларускай дзяржавы (праўда, не заўсёды для беларусаў), на якія перадусім звярталі ўвагу навукоўцы з Германіі. Пачну з дзвюх характарыстык, вылучаных Льюісам.

1. Разрыў паміж гісторыяй і памяццю**,** паміж гісторыяй і сучаснасцю найярчэй праяўляўся для аўтараў у абсурднасці музейнага дыскурсу Беларусі. Фелікс Акерман успамінае сваю вандроўку ў гісторыка-археалагічны музей у гродзенскім Старым замку. Копія артэфакта 18 стагоддзя суправаджалася подпісам на беларускай (а не на польскай, як было ў арыгінале) мове; прадаўшчыца квіткоў за паўтары гадзіны да заканчэння працы папярэдзіла, што яны хутка зачыняюцца; музейная наглядчыца фарбавала пазногці і нервавалася з прычыны цікаўнасці і марудлівасці візіцёра. Адразу ж успомніўся ўласны вопыт наведвання аддзелу рэдкай кнігі ў гэтым музеі – у мяне былі дакладна тыя ж вынікі і ўражанні! І я з уздыхам палёгкі пазбылася коплексу непаўнавартасці: дванаццаць гадоў таму падалося, што гэта менавіта я не прайшла «фэйс-кантролю» і справакавала выключна непрыязнае стаўленне да сябе з боку непадступных супрацоўніц музея. Праўда, спадар Акерман занадта крытычна робіць акцэнт на тым, што Грунвальдская бітва прадстаўлена ў музеі як беларуская гісторыя поспеху, а літоўскі князь Вітаўт – як беларускі валадар (с. 6). У любым гістарычным музеі Літвы мы напаткаем аналагічны перакос – толькі з заменай эпітэта „беларускі” на эпітэт „літоўскі”, – ці не так? А Вялікае Княства было ўсё ж такі агульным домам. Такім чынам, імкненне „перацягнуць коўдру на сябе”, падобна, не з’яўляецца прэрагатывай Беларусі.

2. Вобраз Беларусі як сувязнога звяна найчасцей спалучаецца ў кнізе з вобразам поліфаніі, але адначасова і з вобразам фантомнасці. Функцыянальная асацыяцыя „Беларусі, якая злучае” была зыходным уражаннем Марыён Рутц: яна ўпершыню ўбачыла Беларусь з вакна вагона, едучы з Германіі ў Расію. Пазней працэс спазнання Беларусі (якая паўстала для яе культуралагічнага асэнсавання некранутым „цаліком”) спрычыніўся да яе фарміравання як літаратуразнаўцы-медыявіста. Паступова даследчыца ўсвядоміла зусім іншую – культурную – якасць адчутай першапачаткова транзітнасці, найлепшым прыкладам чаго стала для яе творчасць Мікалая Гусоўскага і Сімяона Полацкага. „Погляд з боку Полацка, Кіева і Вільні ў самой аснове і назаўсёды змяняе пункт гледжання на

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 21:19:44

тыя веды пра даўнія эпохі, якія студэнт-славіст засвойвае ў Германіі" (с. 204). Падобным чынам, краінай „паміж Берлінам і Масквой", але і адначасова краінай неверагоднай поліфаніі запомнілася Беларусь Ніне Велер. Адна і другая аўтаркі актыўна рэфлексуюць свае індывідуальныя перажыванні адчування транзітнасці і поліфанічнасці, пры гэтым адзначаючы ўпартае сляпое „пралятанне" паўз Беларусь заходняй медыйнай прасторы, якая быццам бы ўсяго гэтага не бачыць (ці не хоча бачыць?) на працягу цэлага постсавецкага перыяду. „У той час, – піша Ніна Велер, – як Расія пераўтваралася ў раздутую і бязглуздую стракатую абсурднасць сучаснасці, Беларусь заставалася "белай плямай", маўкліва-гістарычным, кантамінаваным ландшафтам" (с. 235).

Паступовы і нялёгкі шлях спасціжэння поліфанічнасці беларускай літаратуры прайшла Крысціна Кром, для якой адпраўной тэзай у яе беларускіх штудыях было меркаванне перакладчыка Норберта Рандава пра беларусістыку як „пабочнае дзіцё славістыкі" (с. 138). Даследчыца даволі крытычна ацэньвае сродкі масавай інфармацыі Нямеччыны: прэзентаваная імі перспектыва беларускага літаратурнага жыцця – надзвычай палітызаваная. Незалежныя беларускія выданні і выдавецтвы з лёгкай рукі нямецкіх крытыкаў нязменна суправаджаліся атрыбутам „пад пагрозай" або „пад пераследам"; аналітыкі ў Германіі рабілі выразны падзел на рускамоўных пісьменнікаў Беларусі як лаяльных уладам і беларускамоўных як апазіцыйных. А гэта не заўсёды так, тлумачыць Крысціна, і найлепшым прыкладам служыць неаднаразова цытаваны ёю рускамоўны аўтар Дзмітрый Строцаў, на думку якога „беларускім з'яўляецца тое, што распавядае пра беларускае" (с. 139). Ад сябе дадам, што адбытыя Дзмітрыем пятнаццаць содняў у „пасляжнівеньскі" перыяд пацвярджаюць слушнасць высноў Крысціны: рускамоўнасць у Беларусі не азначае лаяльнасці, беларускамоўнасць – зусім не абавязкова знак апазіцыйнасці. Як бачым, фантомамі можа карміць людзей не толькі падкантрольная беларуская прапаганда, але і незалежная заходняя прэса.

Не столькі чыста візуальныя ўражанні пра Беларусь як белы сілуэт на смартфоне („тое, што ўспрымаецца і існуе, аднак пазначае штосьці, чаго няма", Мануэль Гілардучы), колькі глыбокія назіранні і вандроўкі ў гісторыю пераканаўча пацвярджаюць уражанне пра „фантомнасць" сучаснай культурнай выявы краіны. Томас Бон канстатуе поўнае знікненне гістарычнай Беларусі пасля Другой сусветнай вайны; прычына гэтага – не толькі сталінская калектывізацыя сельскай гаспадаркі і не толькі халакост у часы нацыстаў, але таксама ўрбанізацыя ў часы Хрушчова і меліярацыя балот у часы Брэжнева. „Разам з заняпадам яўрэйскіх мястэчкаў пачаўся працэс вымірання беларускай вёскі. Замест мультыкультурнасці ўва ўсіх аспектах жыцця запанавала руская мова як лінгва франка" (с. 37). Важнай у сэнсе разбурэння гістарычных фантомаў з'яўляецца заўвага аўтара, што толькі ў прадмове да Дудкі беларускай (1891) Францішка Багушэвіча назва Беларусь упершыню атрымлівае пашыральнае значэнне, маркіруючы не толькі гістарычную Белую Русь, а больш шырокі тэрытарыяльны абсяг. Разбуральна для любых ідэалістычна-настальгічных постсавецкіх

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 21:19:44

фантомаў гучыць кампетэнтная ацэнка сённяшняй сітуацыі ў краіне: „Фатальныя маштабы набылі пашырэнне ўлады Прэзідэнта, падтрымка планавай эканомікі, падаўленне любой апазіцыі і двухмоўнасці; кіраўніцтва дзяржавы адмовілася ад трансфармацыйных працэсаў, ажыццяўленне якіх дазволіла б краіне заняць дастойнае месца ў Еўропе ў эпоху глабалізацыі" (с. 37–38).

3. Моўная сітуацыя. Фелікс Акерман расказаў пра сваю апанаванасць гарачым жаданнем вывучыць беларускую мову – „бо гэта цалкам натуральна, гэта класна – і гэта трагічна, калі маладыя людзі ў краіне растуць з расколатай свядомасцю менавіта ў моўным плане" (с. 4). Набытыя моўныя кампетэнцыі не прыдаліся, аднак, нямецкаму лінгвісту ў Гродне: застаючыся без сваіх беларускіх сяброў, ён мог цэлымі днямі хадзіць па вуліцах, не маючы магчымасці паразмаўляць з людзьмі па-беларуску. Акрамя таго, вывучыць беларускую мову вельмі няпроста яшчэ і з той прычыны, што ледзь не кожны імкнецца да стварэння сваёй беларускай мовы, каб такім чынам звярнуць на сябе ўвагу. Тут жа з усмешкай успомніла артыкул Валера Булгакава *Мой Багушэвіч*: дыялектыка клясычнага тэксту (1998), які навуковыя кіраўнікі баяцца прапаноўваць студэнтам для падрыхтоўкі курсавых або дыпломных работ: тэкст хочацца перакласці спачатку з „булгакаўскай" на беларускую…

Гун-Брыт Колер прыводзіць вельмі паказальны прыклад моўнага пазіцыянавання і адначасова моўнай эвалюцыі сярод класікаў новай беларускай літаратуры: першыя літаратурныя вопыты Купалы былі рэалізаваны на польскай мове, Коласа – на беларускай, Бядулі – на іўрыце; адзін з нямногіх, хто адразу пачаў пісаць па-беларуску, – Максім Гарэцкі (с. 123–124). Крысціна Кром заклікае звярнуць увагу не на палітычныя, а на ўласна літаратурныя і сацыяльныя механізмы, якія прымушаюць беларускіх аўтараў „упісвацца" ў беларускую літаратуру толькі для таго, каб адкрыць для сябе замежны рынак. Даследчыца канстатуе новы фармат рэалізацыі выслоўя „няма прарока ў сваёй Айчыне": беларускі чытач па добрай волі не чытае айчыннага аўтара, які, у сваю чаргу, шукае шляхі да чытача „ў абход", паколькі наўпроставаму шляху загадзя наканавана параза (с. 140). Падобна, менавіта такім хітра прадуманым «партызанскім» шляхам дайшла да чытача кніга *Радзіва "Прудок"* Андруся Горвата – і зрабілася бестселерам!

Аліса Мюлер, якая першапачаткова зацікавілася Беларуссю менавіта праз яе моўную палітыку, звярнула ўвагу на змену парадыгмаў пасля крымскага крызісу 2015 года: „людзей збянтэжыла логіка, паводле якой рускамоўнае насельніцтва было патрактавана як частка Расіі" (с. 161). Гэта дало штуршок да акцэптавання беларусамі ўсяго таго, што падкрэслівала беларускую ідэнтычнасць – у першую чаргу беларускай мовы: культурна-асветніцкі праект „Мова нанова" сустрэў гарачую падтрымку. Разам з тым, прафесійна даследуючы лінгвістычныя ландшафты, даследчыца найбольш востра адчула „таксічнасць" адносін з Беларуссю: прыязнасць да гэтай краіны балючая. Вялізныя рэкламныя шчыты з агітацыяй на карысць беларускай мовы паслужылі штуршком для выбару тэмы

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 21:19:44

дысертацыі – але адначасова стварылі дэпрэсіўнасць успрыняцця культурнага кантэксту.

4. Вайна і яўрэі. Зразумела, што даследчыкі з Германіі ў сваіх успамінах пра Беларусь не маглі абысці гэтай тэмы. Ушанаванне памяці пра апошнюю вайну ўспрымаецца вельмі па-рознаму. Калі для Фелікса Акермана 60-годдзе Перамогі – гэта толькі „герантафільская ўрачыстасць" (с. 15), то Тобіас Хаберкорн ацэньвае культ вайны з дзяржаўна-гістарычнага пункту гледжання. „Стаўленне да Другой сусветнай вайны, – падкрэслівае даследчык, – і культываванне памяці пра яе – галоўная канстанта ў самаацэнцы беларускай дзяржавы" (с. 95). Пад час параду Перамогі каля Палаца Рэспублікі ў Мінску ён заўважыў людзей у капелюшах з літоўскімі і латышскімі нацыянальнымі колерамі. Людзі прызналіся яму, што прыязджаюць у Мінск адмыслова дзеля ўдзелу ў парадзе, якога, канешне, няма ўжо ані ў Вільнюсе, ані ў Рызе. Сам парад Перамогі даследчык вельмі ўдала патрактаваў як „выраз грамадзянскай згоды, падмацаваны пампезнай інсцэнізацыяй" (с. 96). У сувязі з наведваннем Азарычаў вучоны вельмі дыпламатычна і без наўпроставага асуджэння адзначыў дамінаванне абагульняючага нацыянальнага дыскурсу ў ваенным наратыве, у якім (у адрозненне ад іншых краін) не робіцца акцэнт на яўрэйскай тэме. „Усе замардаваныя там жыхары рэгіёна, згодна з сённяшняй дзяржаўнай устаноўкай, – беларусы. У гэтай іпастасі яны ўвасабляюць нацыянальную траўму сённяшняй дзяржавы, якая іх атаясаміла" (s. 99). Выснова, зробленая аўтарам, робіць гонар яго назіральнасці і аналітычным здольнасцям: слабая прадстаўленасць „яўрэйскай" тэмы ў сучасным ваенна-гістарычным наратыве Беларусі – лакмусавая паперка крызісу нацыянальнай самасвядомасці саміх беларусаў. Аднак не-акцэнтаванне яўрэйскай тэмы ні ў якім разе не сведчыць пра абыякавасць беларусаў да трагедыі яўрэйскага народа (на што яўна намякаюць іншыя аўтары).

Найбольш пераканаўчай (прынамсі для мяне) прэзентацыяй „яўрэйскай тэмы" ў кнізе з'яўляецца артыкул Стэфана Родэвальда. Праз прызму канфесійнай гісторыі даследчык распавядае пра кантакты Сымона Буднага з мясцовымі іўдзейскімі багасловамі, а таксама пра „яўрэйскія" кантакты Полацка ў галіне рэлігійнай палемікі з Заходняй Еўропай. Аўтар паведамляе, што ў канцы 18 ст. Полацк робіцца цэнтрам рэлігійнай палемікі паміж рознымі плынямі іўдаізму, а славутае ўрачыстае перанясенне мошчаў Святой Еўфрасінні Полацкай спрычынілася да рэпрэсій супраць яўрэйскага насельніцтва горада. „Гэтыя мікрагістарычныя спробы асэнсавання гісторыі Полацка, – канстатуе С. Родэвальд, – могуць праілюстраваць, наколькі цэлы рэгіён мог і можа ўбудоўвацца ў надрэгіянальны транскантынентальны кантэкст у любы час" (с. 193).

5. Горад – вёска – „мая Беларусь". Урбаністычная тэма (перадусім „з падачы" гісэнскіх гісторыкаў) поруч з праблемай варыятыўнасці тапонімаў займае асаблівае месца ў кнізе Падарожжы ў Беларусь... Томас Бон напаўняе схему папулярнай гульні „Горад – краіна – рака" беларускім кантэнтам: тры часткі яго артыкула – гэта ўрбаністычны нарыс пра Мінск, экалагічны

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 21:19:44

(і часткова паліталагічны) нарыс пра Белавежскую пушчу, а таксама гісторыка-культуралагічны нарыс, прысвечаны Прыпяці і Палессю, на тэрыторыі якога калісьці каціла свае хвалі Герадотава мора. Мануэль Гілардучы ўвасабляе свае ўражанні ад трох беларускіх гарадоў – Мінска, Брэста і Гродна – у рэчышчы ўспрыняцця беларускай рок-музыкі (перадусім у выкананні гурта „N.R.M.”). Наяўнасць варыянтаў Мінск/Менск аўтар актыўна абыгрывае праз прызму дэканструкцыйных падыходаў – „на радасць Жаку Дэрыда”. Калі наяўнасць трох варыянтаў назвы горада *Nowogródek* – Новогрудок – Навагрудак накіроўвае Генрыха Кіршбаўма шляхам гістарычных асацыяцый часоў напалеонаўскіх войнаў, то трыяда тапанімічных варыянтаў Озаричи – Азарычы – *Ozarich* адлюстроўвае, на думку Тобіаса Хаберкорна, адпаведна, рускую, беларускую і яўрэйскую традыцыі ў намінацыях мясцовацяў. Той жа даследчык акцэнтуе адмысловае значэнне вёскі і наогул сялянскай тэмы ў беларускім культурным кантэксце. Мала ведаючы пра саму краіну, ён ужо шмат ведаў пра прэзідэнта Лукашэнку, які разам з сынам выходзіў у поле, каб выбіраць бульбу (с. 90). Вёска ў Беларусі часам пачынаецца на ўскрайку горада – дастаткова завярнуць за рог дома.

І ўсё ж найбольш яркія ўражанні пакінулі па сабе беларускія гарады. Для Алісы Мюлер Мінск – гэта горад, у якім нішто не адпавядае адно аднаму. Прыгажосць гарадскога ландшафту ўзнікае ў кропцы супярэчнасці паміж горадам узорнага сацыялізму і рэканструяванымі рэшткамі цэнтра горада (s. 156–157). Надзвычайнай цеплынёй прасякнуты вобраз Салігорска, створаны Ленартам Петрыкоўскім. Праз адчуванне „майго Салігорска” – з бюстамі Леніна, з эклектычным музеем – аўтар прыходзіць да ўсведамлення „маёй Беларусі”, у якой вызначаецца адметнасцю і сельская мясцовасць, і гарадская, якая адчуваецца як транзітная зона – але адначасова і як самабытны рэгіён; як русіфікаваны, саветызаваны – і ўсё ж беларускі край. „Гэта краіна, у якой вы адчуваеце сябе еўрапейцам – аднак суровы позірк Леніна сочыць за вамі” (с. 179).

Вельмі важны мэсэдж прагучаў у заключным эсэ – Яна Патрыка Цэлера: нельга давяраць турыстычнаму даведніку (нават з аўтарытэтнай выдавецкай серыі *Lonely Planet*), калі хочаш спазнаць Беларусь. Бо гэты даведнік прапануе эфектную і спакуслівую метафару Беларусі як пакета сапсаванага малака дзесьці ў задняй частцы халадзільніка: кожны ведае, што яно благое, але ўсе хочуць яго панюхаць. Тым часам Патрык, абапіраючыся на ўласны досвед, распавёў, „як малако ціха і незаўважна зрабілася смачным” – менавіта такі загаловак мае яго эсэ. Але трэба прыкласці намаганні, трэба дзеля спазнання Беларусі адмовіцца ад стратэгіі выглядання ў вакно вагона на перон у Брэсце, на якім можна заўважыць адно „бабушку з піражкамі”. Праз такое адмаўленне прайшлі многія аўтары кнігі.

Томас Бон прыводзіць прызнанне нямецкага журналіста, што Беларусь – „найскладанейшая краіна ў свеце”, якая, аднак, паводле меркавання Алісы Мюлер, „нікога ад сябе не адпускае – незалежна ад таго, нарадзіўся ты тут ці толькі пачаў кантактаваць з ёю” (с. 154). У сваю чаргу, не хочацца адпускаць

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 31/10/2026 21:19:44

(дакладней, выпускаць з рук) гэтую надзвычай цікавую кнігу, якая, бясспрэчна, вартая таго, каб дайсці і да беларускага чытача. Няхай неўзабаве – на радасць не толькі Жаку Дэрыда, але і ўсім беларускім інтэлектуалам – з'явіцца версія *Падарожжаў у Беларусь…* у перакладзе на беларускую мову. Беларускі чытач знойдзе тут шмат „інфармацыі да роздуму", паводле выразу з культавага савецкага серыялу пра савецкага шпіёна Шціpліца. У любым выпадку кніга напісана спрактыкаванымі, мудрымі і – што немалаважна – дасціпнымі навукоўцамі. Таму сённяшні нямецкі чытач Падарожжаў у Беларусь… увесь час пераходзіць ад гістарычна-пазнавальнага да побытава-смешнага, ад спрэчнага да аксіяматычнага, ад элегічнай задуменнасці да выяў жывога вірлівага жыцця сучаснай Беларусі. Патэнцыйны беларускі чытач знойдзе ў прапанаваных эсэ штосьці кампліментарна-настальгічнае, штосьці вельмі карыснае і павучальнае, штосьці, магчыма, крыўднае для сябе і не зусім прыемнае, аднак – *Honni soit, qui mal y pense*.

REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Bâzlepkìna, Aksana. (2014). Vobrazy belaruskìh klasìkaŭ u SMÌ ì lìtaratury. U: *Žurnalìstyka-2014*: *stan, prablemy* ì *perspektyvy*. Vyp. 16. (s. 515–517). Mìnsk: BDU. [Бязлепкіна, Аксана. (2014). Вобразы беларускіх класікаў у СМІ і літаратуры. У: *Журналістыка-2014*: *стан, праблемы і перспектывы*. Вып. 16. с. 515–517. Мінск: БДУ].

Bohn, Thomas M; Rutz, Marion (hrsg.). (2020). *Belarus-Reisen. Empfehlungen aus der deutschen Wissenschaft* Wiesbaden: Harrassowitz Verlag.

Lewis, Simon. (2019). *Belarus – Alternative Visions: Nation, Memory and Cosmopolitanism*. Oxford: Routledge.

Martysûk, Natèla. (2017). Sučasny dyskurs farmìravannâ belaruskaj nacyânal′naj ìdèntyčnascì: analìz skrytyh sènsaŭ manìpulâtyŭnaj stratègìì, *Acta Albarutenica*, 17, s. 205–216. [Мартысюк, Натэла. (2017). Сучасны дыскурс фарміравання беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці: аналіз скрытых сэнсаў маніпулятыўнай стратэгіі, *Acta Albarutenica,* 17, с. 205–216].